**Вольга Какшынская**



Галоўны бібліятэкар
Нацыянальнай
бібліятэкі Беларусі

# XXIX
# Рэспубліканскі конкурс «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»: лепшыя з лепшых

**Наталля Карнейчук**



Вядучы бібліятэкар
Нацыянальнай
бібліятэкі Беларусі

14 мая 2021 г. у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ў анлайн-рэжыме былі падведзены вынікі XXIX Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» за 2020 г. У склад кампетэнтнага журы ўвайшлі прадстаўнікі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, абласных бібліятэк, цэнтралізаванай сістэмы публічных бібліятэк г. Мінска.

Конкурс праводзіцца штогод сярод публічных бібліятэк краіны ў два этапы (абласны і рэспубліканскі) па чатырох намінацыях: «За пошукавую і даследчую працу», «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем», «За падтрымку і развіццё чытання», «За навацыі ў сферы бібліятэчнай справы». У конкурсе прынялі ўдзел 34 публічныя бібліятэкі: 15 цэнтральных бібліятэк і 19 бібліятэк-філіялаў.

З дапамогай воблачных тэхналогій усе члены журы атрымалі магчымасць азнаёміцца з дасланымі матэрыяламі напярэдадні пасяджэння і пісьмовым галасаваннем вызначыць пераможцаў сярод гарадскіх бібліятэк і бібліятэк, якія размешчаны ў пасёлках гарадскога тыпу, сельскіх населеных пунктах; адзначыць іх да заахвочвання.

Па выніках конкурсу дыпломамі І, ІІ і ІІІ ступеней былі адзначаны 24 публічныя бібліятэкі, 5 бібліятэк прадстаўлены да заахвочвання. Пераможцы атрымаюць узнагароды адпаведна з загадам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Бібліятэкі-дыпламанты І, ІІ і ІІІ ступеней атрымаюць грашовыя прэміі ў памерах 50, 40 і 30 базавых велічынь адпаведна; бібліятэкі, прадстаўленыя да заахвочвання, – 10 базавых велічынь.

У намінацыі **«За падтрымку і развіццё чытання»** было прадстаўлена 10 работ.

Першае месца сярод гарадскіх і раённых бібліятэк заняла *Цэнтральная гарадская дзіцячая бібліятэка-філіял № 13 Брэсцкай цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя А.С. Пушкіна Брэсцкай вобласці* за рознабаковую станоўчую работу з падрастаючым пакаленнем і рэалізацыю сацыяльна-культурнага праекта па каністэрапіі «Открой себя другу». Праект «Открой себя другу» – адзін з унікальных праектаў у Рэспубліцы Беларусь, які прыцягвае сабак да папулярызацыі чытання і кнігі. Асноўная мэта праекта – стварэнне адзінай чытацкай прасторы ва ўзаемадзеянні школы, сям'і, бібліятэкі і іншых устаноў; стабілізацыя псіхічнага і эмацыянальнага стану пры дапамозе метадаў бібліа- і каністэрапіі (чытанне ўслых сабаку). У гульнёвай форме адбываецца прывіццё любові да чытання дзецям; экалагічнае выхаванне дзяцей праз камунікацыю з жывёламі, развіццё нераўнадушных, спачувальных адносін да іх; раскрыццё творчых здольнасцей юных чытачоў. Акрамя таго, працэс камунікацыі з сабакамі дапамагае супакоіць гіперактыўных дзяцей, знізіць іх узровень трывожнасці. Праект дзейнічае на пастаяннай аснове. У яго межах арганізаваны незвычайны гурток развіваючага чытання «Сачытайка» для дзяцей старэйшага школьнага ўзросту, малодшых школьнікаў і іх бацькоў. Практычнай значнасцю работы гуртка стала выданне кнігі з QR-кодамі па асноўных этапах рэалізацыі праекта і памяткамі па культуры зносін з сабакамі.

Лепшай сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк стала *Азершчынская бібліятэка сямейнага чытання дзяржаўнай установы культуры «Рэчыцкая раённая сетка бібліятэк» Гомельскай вобласці* за выхаванне любові да кнігі, стварэнне спрыяльных умоў для змястоўнага правядзення вольнага

часу ўсёй сям'ёй; рэалізацыю шэрага краязнаўчых праектаў, скіраваных на далучэнне дзяцей і падлеткаў да памяці продкаў, багатай і цікавай гісторыі сваёй мясцовасці: «Легенды і паданні вёскі Азершчыны», краязнаўчы маршрут «Мой край – вёска Азершчына», «Сцяжынкамі роднага краю», «Жар-птушка», «Непаседы і фантазёры», «Ад папіруса да флэшкі, альбо Кніга сваімі рукамі», «BookTeART». Гэта далёка не поўны пералік рэалізаваных бібліятэкай праектаў.

Самых актыўных абаронцаў экалогіі сабрала ў бібліятэцы аб'яднанне «Кропелька». У віртуальнай прасторы Азершчынская бібліятэка сямейнага чытання прадстаўлена праз уласны блог «Букняша».

У намінацыі **«За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем»** бібліятэкамі было даслана восем работ.

Першае месца сярод гарадскіх і раённых бібліятэк прысуджана *філіялу «Гарадская дзіцячая бібліятэка» дзяржаўнай установы культуры «Смаргонская раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці* за пераадоленне сацыяльнай ізаляванасці дзяцей з інваліднасцю шляхам стварэння ў бібліятэцы лялечнага тэатра «Праменьчык» у рэжыме анлайн.

Лялечны тэатр створаны з дапамогай мясцовай ініцыятывы Смаргонскай раённай арганізацыі рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» у рамках праекта «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь», які рэалізуецца Праграмай развіцця ААН (ПРААН). Назва ініцыятывы – «Арганізацыя асяроддзя для пераадолення сацыяльнай ізаляванасці дзяцей з інваліднасцю з дапамогай стварэння лялечнага тэатра "Праменьчык" у рэжыме анлайн у гарадской дзіцячай бібліятэцы». Партнёрам таксама выступіла дзяржаўная ўстанова адукацыі «Смаргонскі цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі».

Дзякуючы атрыманаму гранту, у філіяле быў праведзены рамонт памяшкання для выступленняў лялечнага тэатра; закуплены новыя пальчаткавыя лялькі, складныя крэслы для маленькіх гледачоў, зручная ў выкарыстанні шырма; набыта перыферыйнае абсталяванне. Дзеці з інваліднасцю пачалі прымаць актыўны ўдзел у масавых мерапрыемствах бібліятэкі, займацца лялечнымі пастаноўкамі, удзельнічаць у спектаклях пры дапамозе камп'ютара і камеры.

Сярод бібліятэк, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці, адзначана *Браніслаўская сельская бібліятэка дзяржаўнай установы культуры «Жыткавіцкая раённая сетка бібліятэк» Гомельскай вобласці* за сацыяльнае партнёрства бібліятэкі і школы па прывіцці дзецям і падлеткам цікавасці да кнігі, папулярызацыю краязнаўчых ведаў, экалагічнай асветы, здаровага ладу жыцця, патрыятычнага, духоўна-маральнага выхавання, прафесійнай арыентацыі, арганізацыю вольнага часу.

Сумесна з дзяржаўнай установай адукацыі «Браніслаўскі дзіцячы сад-базавая школа», на базе якой функцыянуе інтэграваная бібліятэка, паспяхова рэалізуецца праект «Бібліятэка і школа – тэрыторыя чытання», у рамках якога для дзяцей і падлеткаў праводзяцца разнастайныя мерапрыемствы: гульні-падарожжы, віктарыны, інтэрактыўныя гульні, квэст-гульні, літаратурна-музычныя кампазіцыі, фальклорнае падарожжа, літаратурна-гульнёвыя праграмы і г. д.

Цікавасць да вывучэння культуры і традыцый Беларусі, да беларускай народнай творчасці фарміруюць створаныя на базе бібліятэкі гурткі па дэкаратыўна-прыкладным мастацтве «Цуд-саломка» (навучанне мастацтву саломапляцення і вырабу аплікацый з саломкі) і «Рукадзельніца» (навучанне бісерапляценню, вышыўцы атласнымі стужкамі, фларыстыцы і іншым відам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва).

У намінацыі **«За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы»** на разгляд журы было прадстаўлена восем работ.

Першае месца сярод гарадскіх і раённых бібліятэк прысуджана *Цэнтральнай раённай бібліятэцы дзяржаўнай установы культуры «Светлагорская раённая сетка бібліятэк» Гомельскай вобласці* за рэалізацыю маштабнага сеткавага інтэрнэт-праекта «Библиотека. Перезагрузка», у межах якога бібліятэкары распавядалі аб новых цікавых кнігах, чыталі дзецям казкі, праводзілі займальныя майстар-класы, анлайн-агляды віртуальных выстаў, гучныя чытанні, збіралі звесткі і цікавыя факты з гісторыі Светлагорскага раёна. Карыстальнікам патрэбна было толькі самастойна зайсці ў сацыяльныя сеткі («ВКонтакте», «Одноклассники», «Instagram»), глядзець і слухаць.

Удзел у праекце прымалі ўсе гарадскія бібліятэкі. З гэтай нагоды быў распрацаваны лагатып раённай сеткі бібліятэк і бібліякарта з указаннем месца размяшчэння бібліятэк у горадзе. Бібліякарты былі размешчаны пры ўваходзе ў гарадскія бібліятэкі. У рамках праекта «Библиотека. Перезагрузка» рэалізоўваўся шэраг падпраектаў: «Неделя без портфеля», «Твердый переплет», «Книжный алфавит», «1418 героических строк», конкурс прафесійнага майстэрства «Книга как память о войне» і г. д.

Дадзены праект пацвердзіў сваю неабходнасць і запатрабаванасць у грамадстве.

Сярод бібліятэк, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці, першае месца атрымала *Ляснянская бібліятэка-музей дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная сетка публічных бібліятэк Слаўгарадскага раёна» Магілёўскай вобласці* за распрацоўку і рэалізацыю інавацыйных праектаў «Лясная – месца воінскай славы» і «Музей пад адкрытым небам», што дазволіла прыцягнуць фінансавыя сродкі Міжнароднага фонду развіцця сельскіх тэрыторый і тым самым надаць новы імпульс развіцця бібліятэкі-музея, турыстычнага і экскурсійнага патэнцыялу Слаўгарадскага раёна.

Праект «Лясная – месца воінскай славы» рэалізаваны пры падтрымцы мясцовага фонду развіцця сельскіх тэрыторый «Адраджэнне-Агра», Міжнароднага фонду развіцця сельскіх тэрыторый; праект «Музей пад адкрытым небам» – у рамках праекта «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь».

У выніку рэалізацыі праектаў значна палепшылася матэрыяльна-тэхнічная база бібліятэкі-музея; распрацавана новая інтэрактыўная форма работы – анімацыйная праграма «Па слядах Паўночнай вайны»; створаны музей пад адкрытым небам, які стаў своеасаблівым працягам экспазіцыі, аформленай у бібліятэцы-музеі.

У намінацыі **«За пошукавую і даследчую працу»** на разгляд журы, як і ў дзвюх папярэдніх намінацыях, было даслана восем работ.

Першае месца сярод гарадскіх і раённых бібліятэк было прысуджана *Глыбоцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы дзяржаўнай установы культуры «Глыбоцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Віцебскай вобласці* за пошукавую і даследчую працу па вывучэнні гісторыі ўзнікнення і станаўлення перыядычнага друку на тэрыторыі Глыбоцкага краю і стварэнне даведачнага выдання «Перыядычны друк Глыбоччыны (1924–2020 гг.)».

Гэта першае асобнае даследаванне, якое асвятляе гісторыю ўзнікнення перыядычнага друку на Глыбоччыне, дае дакладную і поўную бібліяграфічную інфармацыю пра мясцовыя газеты і часопісы, удакладняе інфармацыю аб персаналіях, звязаных з выдавецкай дзейнасцю. У дапаможніку ахарактарызаваны 24 выданні (без уліку іх перайменавання), прыводзяцца цікавыя факты з пункту гледжання гісторыі, ідэалагічнага зместу і масавасці.

У якасці дадаткаў прыводзяцца бібліяграфічны спіс перыядычных выданняў Глыбоччыны, паказальнік імёнаў выдаўцоў, рэдактараў, журналістаў і іншых асоб, якія згадваюцца ў тэксце, а таксама фотаздымкі і ілюстрацыі, звязаныя з гісторыяй перыядычнага друку.

Выданне адрасавана гісторыкам, краязнаўцам, бібліятэчным супрацоўнікам, спецыялістам органаў друку і сродкаў масавай інфармацыі, выкладчыкам, студэнтам, а таксама ўсім, хто цікавіцца працэсам развіцця перыядычнага друку на Беларусі.

Сярод бібліятэк, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці, адзначана *Завалочыцкая сельская бібліятэка дзяржаўнай установы культуры «Сетка публічных бібліятэк Глускага раёна» Магілёўскай вобласці* за пошукавую і даследчую работу па вывучэнні роднага краю і стварэнні інфармацыйнага рэсурсу «Завалочыцкі край». У аснову пошукавай работы была пакладзена мэтавая праграма «Мой родны кут – мой клопат і мой лёс» (2018–2020), у рамках якой бібліятэкарам сабрана вялікая колькасць матэрыялаў з гісторыі вёскі Завалочыцы, у тым ліку пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны. На падставе сабранага матэрыялу створаны электронны краязнаўчы рэсурс «Завалочыцкі край, які прадстаўляе ўнікальныя звесткі з гісторыі вёскі, цікавыя факты аб знакамітых земляках, гістарычныя матэрыялы аб ваенных падзеях на тэрыторыі краю, успаміны жыхароў пра жыццё вёскі, партызанскі рух краю, вершы, легенды, паданні.

Інфармацыйны рэсурс адрасаваны шырокаму колу карыстальнікаў, усім тым, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю, духоўнай культурай беларускага народа, а таксама аматарам краязнаўства.

Зразумела, што вылучыць лепшых сярод такой колькасці таленавітых удзельнікаў аказалася даволі няпростай задачай для членаў журы. Даведацца аб усіх пераможцах конкурсу можна на партале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (https://www.nlb.by).

Мы спадзяёмся, што ўдзельнікі наступнага юбілейнага XXX Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» ўразяць журы яшчэ больш цікавымі і ўнікальнымі праектамі, ідэямі па ўзмацненні ролі публічных бібліятэк у фарміраванні нацыянальнай свядомасці насельніцтва, распаўсюджванні ідэі беларускасці, прапаганды нацыянальнай спадчыны, гісторыі, літаратуры, мовы, народнай культуры, падтрымкі і развіцця чытання.

Summary

The article summarizes the XXIX Republican contest “Library is space national culture”.

*Матэрыял аб выніках XXIX Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» чытайце на с. 3–5*















